Гомельская Вясна
праваабарончы сайт

# Абаронца Артура Рыбіна: У суда не павінна быць задачы – адпомсціць маладому чалавеку

30.07.2021




Сёння ў судзе над 25-гадовым Артурам Рыбіным, якога вінавацяць па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу «Хуліганства» і «Распальванне варожасці» адбыліся судовыя спрэчкі.

Нагадаем, маладзёна з Гомля судзяць за выраб канструкцыі з партрэтам Лукашэнкі, перакуленага дагары нагамі з гербам на ілбе, з расфарбаванымі чырвоным колерам вуснамі і надпісам «гары ў пекле», які ён усталяваў у малалюдным месцы, сфатаграфаваў і размясціў фота ў тэлеграм-чатах.

Таксама яму інкрымінуюць распальванне сацыяльнай варожасці. Ён напісаў пост 11 лютага ў тэлегра-чаце: «Увесну трэба выходзіць і не сыходзіць з вуліцы. Калі цябе б'юць, можна біць у адказ».

Артур Рыбін

Пракурорка Жана Дударава адзначыла, што «*11 лютага Рыбін знаходзіўся па месцу жыхарства, з выкарыстаннем мабільнага тэлефону «Самсунг», карыстаючыся вольным доступам да сеткі інтэрнэт, размясціў у тэлеграм-чаце свае выказванні пабуджальнага характару, якія заклікалі да гвалтоўных дзеянняў, дзеянняў скіраваных на прычыненне шкоды адной групы асоб у дачыненні да іншай групы асоб, аб'яднаных па прыкмеце прафесійнай прыналежнасці».*

На думку пракуроркі, ягоныя выказванні прагледзела неабмежаваная колькасць людзей, некаторыя з іх пакінулі каментары дзе яны падзяляюць негатыўную адзнаку Артура Рыбіна супрацоўнікаў аховы правапарадку і якія скіраваны на ўзбуджэнне сацыяльнай варожасці па прыкмеце сацыяльнай прыналежнасці.

> *«Абвінавачаны ў судзе сказаў, што віну цалкам прызнае, – сказала абвінаваўца, – не адмаўляў практычныя абставіны справы, аднак выказаў нязгоду з інкрымінуемымі яму хуліганскімі матывамі, адмаўляў, што заклікаў да гвалтоўных дзеянняў у дачыненні да міліцыянтаў. Гэта сведчыць у цэлым пра непрызнанне ім сваёй віны ў здзяйсненні злачынстваў».*

Віна Рыбіна на думку пракуроркі пацвярджаецца сукупнасцю сабраных па справе доказаў.

Сведкі міліцыянты паказалі, што яны атрымалі інфармацыю пра знаходку канструкцыі на пустцы, на месца выехала следчая аператыўная група АУСу Савецкага раёну, сапёрна-тэхнічная група вайсковай часткі. Падчас агляду з удзелам сабакі, выбуховых рэчаў не знайшлі.

> *«Доказы віны Рыбіна: пратакол агляду месца злачынства, з якога вынікае, што быў знойдзены выраб у выглядзе крыжа з выявай і надпісам, пратакол вобшуку ад 12 сакавіка 2021 года па месцу жыхарства Рыбіна, калі былі канфіскаваны мабільны тэлефон «Лінова», пры дапамозе якога, маладзён фатаграфаваў, мабільны тэлефон «Самсунг» і сім-карта «Лайф», пры дапамозе якой Рыбін выходзіў у інтэрнэт і друкаваў паведамленні".*

Вінаватасць Рыбіна, як паведаміла дзяржабвінаваўца, пацвердзіла і лінгвістычная экспертыза ад 7 мая 2021г. яго паведамлення ад 11 лютага: «Увесну трэба выходзіць на вуліцы. Выходзім і стаім, нас б'юць, б'ем у адказ. Толькі так, інакш ніяк. Пытанне толькі ў тым, колькі беларусаў падтрымаюць такі фармат». Лінгвісты прыйшлі да высновы, што гэтыя выказванні маюць пабуджальны характар, і заклікаюць да гвалтоўных дзеянняў групы 1 (людзі, якія жывуць у Беларусі), да групы 2  (супрацоўнікі аховы правапарадку).

Такім чынам, лічыць пракурорка Дударава віна Рыбіна даказана ў поўным аб'ёме сукупнасцю прыведзеных доказаў. Пра грубае парушэнне грамадскага парадку сведчыць, тое, што Рыбін вырабіў, устанавіў у публічным месцы, сфатаграфаваў сваю канструкцыю. *«Рабіў гэта адкрыта і дэманстратыўна. Аб яўнай непавазе да грамадства сведчыць грэбаванне абвінавачаным агульнапрынятымі нормамі паводзінаў у грамадстве, актыўнае супрацьпастаўленне інтарэсам грамадства ў цэлым, грэблівае стаўленне да ўсталяванага ў грамадстве парадку».*

Пра тое што дзеянні абвінавачанага характарызуюцца выключным цынізмам, на думку дзяржабвінаваўцы, сведчыць усталяванне зробленага ім вырабу ў грамадскім месцы, ў тым ліку каля 1-га аддзялення міліцыі Гомля дзеля дэзарганізацыі працы праваахоўных органаў і іншых спецслужбаў. *«Рыбін меў памкненне да дэстабілізацыі абстаноўкі ў грамадстве».*

> *"Пры прызначэнні пакарання трэба ўлічыць ступень цяжкасці злачынства і грамадскай небяспекі і характарыстыкі абвінавачанага, – адзначыла пракурорка, які «нідзе не працуе, віну не прызнаў, у зробленым не раскаяўся. Рыбін неаднаразова прыцягваўся да адміністратыўнай адказнасці, што характарызуе яго як асобу, схільную да правапарушэнняў. Абставінаў змякчальных ці абцяжарваючых па справе не знойдзена. Прызначэнне пакарання – пазбаўленне волі будзе садзейнічаць перадухіленні супрацьпраўных дзеянняў з боку Рыбіна", – рэзюмавала пракурорка.*

Дзяржабвінаваўца прапанавала прызнаць Рыбіна вінаватым па двух артыкулах і прызначыць яму агулам пакаранне 4 гады калоніі агульнага рэжыму (1 год па першым артыкуле і 3 гады па другім).

Яна прапанавала суду канфіскаваць мабільныя тэлефоны «Лінова» і «Самсунг», спагнаць з Рыбіна ў прыбытак дзяржаве 83 рублі за выезд следчай групы на месца злачынства, а таксама працэсуальныя выдаткі. «Рэчавыя доказы: выраб з партрэтам Лукашэнкі на крыжы, сцяг бчб, 2 бчб налепкі і сім-карту – знішчыць. Дзве кнігі «Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь» перадаць абвінавачанаму».

Абаронца Рыбіна адвакат Юрчанка па першым артыкуле «Хуліганства» пагадзіўся з дзяржабвінаваўцай і адзначыў, што насамрэч яго падабаронны парушыў грамадскі парадак, калі ўсталяваў сваю інсталяцыю, хай сабе і ў такім малалюдным месцы, як пустка каля водазабору.

> *«Лічу нейкай непаразумеласцю выказванне дзяржабвінаваўцы, што надзвычайнага цынізму ўчынку Рыбіна з усталяваннем канструкцыі надае той факт, што побач знаходзіцца аддзяленне міліцыі. – заўважыў абаронца. – У той час як апытаны сведка – участковы міліцыянт распавёў у судзе, што гэтае месца – прыстанішча асацыяльных людзей: бамжэй і алказалежных. Таму гэтае месца не можа быць нейкім выключным. І яшчэ цынізму надае, на думку дзяржабвінаваўцы, той факт, што на месца выязджалі шмат міліцыянтаў, экспертаў. Гэта не зусім мае прамую, прычынную сувязь са злачынствам Рыбіна».*

Але адвакат цалкам не пагадзіўся з абвінавачаннем па другім арт. 130 (Распальванне варожасці).

*«Артыкул сам гучыць так «распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай альбо іншай сацыяльнай варожасці і розні. – працытаваў абаронца, – Рыбіна абвінавачваюць ва ўзбуджэнне «іншай сацыяльнай варожасці» па прыкмеце іншай сацыяльнай прыналежнасці. Гэты артыкул прадугледжвае распальванне варожасці па прыкмеце сацыяльнай прыналежнасці. Я якая ў нашай справе іншая сацыяльная прыналежнасць? Каб было зроблена злачынства супраць бамжэй, секс-працаўніц, дык можна было б неяк падцягнуць гэта пад гэты артыкул. Тут атрымліваецца, што абвінавачанне дзеліць людзей па прафесіях: прафесія міліцыянта, пракурора, лекара, адваката ці педагога і т.д. Такім чынам абвінавачанне Рыбіну не адпавядае артыкулу, не гледзячы на тое, што ён прызнае гэтае абвінавачанне. Няма тут прыкметы распальванне нейкай іншай сацыяльнай варожасці ў яго закліку: «Увесну трэба выходзіць і не сыходзіць з вуліцы. Калі цябе б'юць, можна біць у адказ».*

*«І наконт пакарання - хачу звярнуць увагу суду на той факт, што дзяржабвінавачанне не знайшло змякчальных, ці абцяжарваючых абставінаў. – адзначыў абаронца, – Разам з тым, пракурорка запрасіла амаль максімальнае пакаранне па двух артыкулах. Гэтыя артыкулы прадугледжваюць і штраф і «хімію» і арышт, а не толькі пазбаўленне волі. А абвінавачаны ж малады чалавек, упершыню прыцягваецца да крымінальнай адказнасці, характарызуецца не станоўча, але ж такіх станоўчых грамадзянаў у нас не так багата, каб яны былі беззаганныя. Не абавязкова ж яму за гэта даваць максімальнае пакаранне. Пры гэтым калі звярнуцца да Крымінальнага кодэксу арт.2 і 3 – задачы Крымінальнага кодэксу – спрыяць папярэджанні злачынстваў, выхаванню грамадзянаў у духу выканання заканадаўства РБ.*

*Якое тут выхаванне? Даўно прайшлі падзеі восень мінулага году, калі там нешта хісталася, былі масавыя выступы, але зараз усё добра, упэўнена і роўна знаходзіцца. Якая неабходнасць тут караць каб перадухіліць злачынства? Задача Крымінальнага кодэксу – не помста за нешта. Трэба разглядаць з гледзішча актуальнасці гэтага злачынства. Актуальнасць такіх вырабаў, якія зрабіў Рыбін, даўно ўжо прайшла і таму, тут не павінна быць задачай суду адпомсціць маладому чалавеку, а толькі пакаранне за дзеянне».*

Суд над Рыбіным прыцягнецца 2 жніўня ў 16.00 у абласным судзе. Яшчэ будзе апошняе слова абвінавачанага і абвяшчэнне прысуду.

Аўтар Ларыса Шчыракова

Фота аўтара і з сацсеткі ВК

Гомельская вясна

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2021

### СВАБОДА СХОДАЎ

Тры гады "хатняй хіміі" — за знаходжанне на праспекце і парушэнне працы "Мінсктранса"

Дзяржабвінавачанне запрасіла два гады калоніі для палітвязня Івана Багдзевіча

Што адбывалася ў судах па адміністрацыйных справах цягам тыдня?

Ці можна трапіць у калонію, калі своечасова не зняў бчб-сняжынкі з акна? Юрыст расказвае пра змены ў Крымінальным кодэксе

Вынікі судовых разглядаў адміністрацыйных спраў за 4 і 7 чэрвеня

Распавядаем пра травень у «сутках» і штрафах (+інфаграфіка)

Суткі і штрафы - пакаранне для затрыманых у мінскім парку "Цівалі"

Вынікі разглядаў судамі адміністрацыйных спраў за 31 траўня - 2 чэрвеня

У Мінску пачаўся суд над палітвязнем Іванам Багдзевічам





Сястра асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Паўлава: "Яго хутчэй за ўсё расстралялі"

Андрэй Палуда: "Пакуль няма сістэмных зменаў, новыя прысуды і расстрэлы могуць адбыцца ў любы момант"

Вярхоўны суд не задаволіў апеляцыйную скаргу асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Скрундзіка

Асуджаных да смерці братоў Косцевых памілавалі

## ВІДЭА



## БЛОГІ



### ЛЕАНІД СУДАЛЕНКА

ЯК Я НЕ СТАЎ УДЗЕЛЬНІКАМ НАРОДНАГА "ХУРАЛА" ЦІ ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!



### ЛАРЫСА ШЧЫРАКОВА

Як прайшла спецаперацыя ГУБАЗіК па пошуку брудных майткоў у журналісткі ці кароткая гісторыя аднага пратрусу

## НАВІНЫ ПАРТНЁРАЎ

04.06.2024 "А праўда, што наша маці ў турме?" Маці палітзняволенай ўзяла пад апеку ўнукаў, а ў Польшчы ўсынавіла яшчэ двух дзяцей «Медиазона»

31.05.2024 Блогер Павук пра свой завочны суд паводле 14 артыкулаў: "Гэта яны нас баяцца" радыё «Свабода»

29.05.2024 Работнікаў прадпрыемстваў "Гомсельмашу" пагрозамі прымушаюць падпісвацца на тэлеграм-канал холдынгу «Зеркало»

28.05.2024 Што рабіць, калі ў Беларусі адключаць VPN? «Зеркало»

27.05.2024 У Гомелі хочуць стварыць асобны спіс вакансіяў для былых зняволеных "Гомель штодзень"

## ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў СВЕЦЕ

03.06.2024 З сённяшняга дня Літва забараніла ўвоз беларускай і расійскай сельгаспрадукцыі

17.04.2024 Пракурор змяніў абвінавачанне па злачынству, у выніку якога памерла беларуска ў Варшаве

10.04.2024 Голад у сектары Газа

09.04.2024 Сектар Газа: навязаны Ізраілем голад смяротны для дзяцей

04.04.2024 У траўні Беларусь і Расію могуць выключыць з Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі

## САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ




## ПАРТНЁРЫ

Праваабарончыя сайты:

🔗 Брэст 🔗 Віцебск 🔗 Гародня 🔗 Магілёў

stryzhakandrej@gmail.com | sutiajnik@gmail.com

© 2024 Гомельская вясна